


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
|---|---|
| **Кніга водгукаў** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **Успаміны і персаналіі** | **Да спрэчных пытанняў або моцныя бакі музея-запаведніка як спецыфічнай музейнай установы** |
| **Тэлеканал “АНТ” на выставе “Вытокі духоўнасці”** | |
| **Праект, прысвечаны асобе Яўгена Куліка** | |
| **Выстава ўз'яднання Беларусі** | |


## ***Навіны***

### Кніга водгукаў

**2020**

“Большое спасибо вам за выставку. Я узнала много интересного об истории Заславля! С Рождеством и Новым годом!” (Наталля і Варвара, Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя, 5 студзеня).

“З Новым годам! Дзякуем за выставу беларускай керамікі і вырабаў мастачкі *[майстра-керамicта – рэд.]* Таццяны Чацвернiной. Сапраўднае мастацтва радуе душу і натхняе (Т. Трубач, В. Шарэйка, 26 студзеня).

“Посетила этот музей. Очень интересно было, спасибо за хороший рассказ о Заславле” (госця музея, 5 лютага).

“Круто, я из Казахстана, г. Караганда” (госць музея, 28 лютага).

“Благодарим Татьяну Владимировну *[Арлову – рэд.]*, всех работников музея за прекрасную экскурсию, за возможность окунуться в историю, вернуться в детство. Очень всё интересно! Дети, Елена и Людмила. Музычуки” (24 чэрвеня).

“Внуки Хатько очарованы самим комплексом и людьми, здесь работающими, тёплыми, знающими, болеющими за своё дело! Спасибо сердечное” (сям’я Хацько, г. Барысаў, 19 ліпеня).

“С огромной благодарностью к сотрудникам музея… Всегда, когда прихожу сюда, очень любезны, всё покажут, всё расскажут… Музей всегда в прекрасном состоянии, прекрасная энергетика, сад всегда ухожен с большой любовью… Огромное спасибо. Хочется приходить сюда снова и снова…” (Дзюба С.І., ліпень або жнівень).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

“Спасибо большое за экскурсию, а также гостеприимство и участие в познавании белорусской культуры хранительнице залов Галине Александровне Меньковской, а также всему персоналу выставочного комплекса” (госць музея, 9 жніўня).

“Спасибо огромное. Весьма увлекательно. Экскурсии очень познавательные и душевные. Отличное место, которое обязательно посоветуем посетить своим знакомым” (госці музея, 10 верасня).

“Искренне хочется поблагодарить дирекцию музея за предоставленную возможность совершить экскурсию по прекрасным залам вашего музея. Особые слова благодарности художнику Балыш Анастасии Ивановне за увлекательную экскурсию по экспозиции “Яблочный Спас”, за возможность прикоснуться к прекрасным творениям наших белорусских

художников, живущих в этом городе, и узнать больше о славянских традициях. Желаем творческих успехов всему коллективу музея!” (класны кіраўнік і навучэнцы 6 “а” класа Заслаўскай гімназіі, 18 верасня).

## Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [рэд.]*.

### ***Як пачыналася***

### МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,
### ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА

**Карысная літаратура па музейнай справе і іншае** *[працяг – рэд.]*

*Адукацыя/прадстаўленне (інтэрпрэтацыя)*

– Alderson, W.T., Low, S.P. Interpretation of Historic Sites. Second Edition, Reveised. AASLH, Noshville, 1985. – 202 p.

– Anderson, J. Time Machines. The World of Living History. – Nashville, AASLH, 1984. – 213 p.

– Alfrey, J. and Putman, T. The Industral Heritage, London : Routledge, 1992. – 327 p.

– Karp, I., Kreamer, C., and Lavine, S. (eds) Museum and Communities; The Politics of Public Culture, Washington, D.C. Smithonian Institution Press, 1992.

– Museum Education Roundtable. Patterns in Practice, Washington, D.C. : Museum Education Roundtable, 1992.

– Perce, S. (ed) Objects of Knowledge, London : The Athlone Press, 1990.

– Simpson, M.G. Making representations: museums in the post-colonial era. – London : Routledge, 1996. – 294 p.

– Uzzell, D. (ed) Heritage Interpretation, Vol. 1. The Natural and Built Environment; Vol. 2. The Visitor Experience. – London : Belhaven Press, 1989.

Падрыхтоўка музейных экспазіцый

– Belcher, M. Exibitions in Museums, Leicester: Leisester University Press, 1991.

– Dean, D. Museum Exhibition. Theory and Practice. – London and New York, Routledge, 1994.
– Hall, M. On Display: A Design Grammar for Museum Exibitions, London : Lund Humphries, 1987.
– Neal, A. Exhibits for the Small Museum, Nashville : AASLH, 1976.

Умовы / Бяспека

– International Committee on Museum Security. A Manual of Basic Museum Security, London : Butterworths, 1986.
– Olkowsky, W., Doar, S., and Olkowsky, H. Common-Sense Pest Control, Newton, CT : The Taunton Press, 1991.




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

Фінансавая стратэгія музея

– National Endoument for the Humanities: Guidelines and Applications for Humanities Progects in Museum and Historical Organizations. Washington, D.C. 1993.
– Lauffer, A. Grants, Ets., Sage Publications, 1997.
– National Gide to Finding in Arts and Culture. 5-th ed. New York, The Foundation Center, 1998.
– Guide to Finding for International and Foreign Programs. 4-th ed. New York, The Foundation Center, 1998.
– Rosso, H.A. Achieving Excellence in Fund Raising: A Comprehensive guide to Principles, Strategies, and Methods. Jossey-Bus Inc. Publishers, 1991.

– Stolper, C., and Hopkins, K. Successful Fundraising for Arts and Cultural Organizations, Phoenix, AZ. : The Onex Press, 1989.

Заканадаўства. Этычныя нормы

– Code of Professional Ethics, ICOM // Kavanagh, G. (ed.) Museum Provision and Professionalism. Routledge. London & New York., 1994.
– Convention conserning the Protection of the World Cultural and Natural Haritage, 16 November 1972 // Conventions and Recommendations of UNESCO concerning the protection of the cultural heritage. – Paris, 1985.
– Gathercole, P. and Lowental, D. (eds.) The Policies of the Past, London : Unwin Hyman. – 1990.
– Kluwer, B. Monument Protection in Europe, Amsterdam : Deventer, 1989.
– Malaro, M.C. A Legal Primer on Managing Museum Collections. – Washington, D.C., Smithonian Institution Press, 1985.
– Weil, S.E. Beauty and the Beast – On Museums, Art, the Law and the Market, Washington, 1993.

Адносіны з публікаю

– French, Y. The Handbook of Public Relations, London : The Museum development Company, 1991.
– International Council of Museums. Public View, The ICOM Handbook of Museum Public Relations, Paris: The International Counsil of Museums, 1986.
– Merriman, N. Beyong the Glass Case, Leicester : Leicester University Press, 1991.
– Pearce, S. Museum Economics and Community, London : Athlone Press, 1991.

Дакументацыя і ўлік

– Didley, D.,Wilkinson, I., Museum Registration Methods (3rd ed.) Washington, D.C. AAM, 1981.
– Eri, I. and Vegh, B. Dictionarium Museologicum, Budapest, 1986.
– Light, R., Robert, D., and Stewart, J. Museum Documentation Systems, London : Butterworths, 1986.

**Як прасіць грошы?** *[на рэалізацыю ініцыятыў – рэд.]*

1. Звужэнне пошуку. Магчымыя дзялянкі – прадмет, пад што шукаюцца грошы і геаграфічныя характарысткі, – ці даваліся (даюцца) грошы раней твайму рэгіёну, краіне, музею.
2. Выхад непасрэдна праз Інтэрнэт на вэб-сайт фондадацеля, знаёмства з яго магчымымі абмежаваннямі і папярэднімі грантамі, іх памерамі, тэрмінамі.
3. Ліст-заяўка, прычым, часцей за ўсё лепш ліст, а не е-мэйл, аб'ёмам прыкладна 1-1,5 старонкі.

Пажаданая структура:
а) Мэта праекта, пад які шукаецца грант;
б) Праблемы, на вырашэнне якіх праект арыентаваны;
в) Інфармацыя пра арганізацыю, якая праводзіць праект;
г) Прыкладны сумарны бюджэт;
д) Перыяд часу, на які грант запытваецца;
е) Кваліфікацыя тых, хто будзе прыцягнуты да яго рэалізацыі.
5. У выпадку станоўчага павароту – запытальнік атрымлівае спецыяльны бланк на афармленне заяўкі.
6. Этап чакання гранту, сума якога звычайна аказваецца меншаю за запытваемую.
7. Пералічэнне 10% ад атрыманай сумы на асабісты рахунак аўтара парады.

**Ад каго па-сапраўднаму залежыць поспех музея?**

*“Не ад будынку і не ад калекцый залежыць поспех музея і яго карыснасць, а ад дырэктара. Менавіта ён са сваім калектывам ёсць жыццё і душа ўстановы”* / **Вільям Флаўэр** – дырэктар Брытанскага Прыродазнаўчага музея, канец XIX стагоддзя / [13].

**Каго можна занесці ў спіс лепшых музейных дырэктараў-наватараў?**

Адказ знаходзіцца ў кніжцы вядомага музейнага аўтарытэта **Эдварда Александэра** – колішняга дырэктара праграмы падрыхтоўкі музейных спецыялістаў і на працягу 26 гадоў дырэктара службы прадстаўлення **Каланіяльнага Вільямсбурга**. Ён вызначыў 12 асобаў, якія паклалі навуковую думку ў падмурак сваіх музеяў і здолелі павярнуць іх у новым накірунку, што застаецца істотным па сённяшні дзень.

**1. Ханс Слоўэйн (1660-1753)** – у 1753 годзе пакінуў Ураду Англіі ў спадчыну (за ўмераную плату) прыватную калекцыю, з якой нарадзіўся **Брытанскі Музей**.

**2. Чарльз Піл (1741-1827)** – у 1786 годзе адкрыў і кіраваў прыватным музеем ў Філадэльфіі, ЗША – моцна арыентаваўшы яго на навукова-асветную дзейнасць.

**3. Дамінік Дэнон (1747-1825)** – пасля 1802 года заснаваў **Музей Напалеона** ў Лувры, Парыж, Францыя.

**4. Вільям Хукер (1785-1865)** – пачынаючы з 1841 года трансфарміраваў **Каралеўскі Батанічны Сад у К'ю** каля Лондана ў сучасны музей, Англія.

**5. Генры Кул (1808-1882)** – з 1852 года дырэктар музея, які пазней атрымаў назву **Вікторыі і Альберта**, арганізатар першых сусветных выставак. Лондан, Англія.

**6. Ганна Кунінгэм (1816-1875)** – у 1858 годзе заснавала першую гістарычную хату-музей у ЗША – **маёнтак Джорджа Вашынгтона** недалёка ад Вашынгтона.
**7. Вільгельм фон Бадэ (? – 1929)** – у 1872 годзе становіцца на чале **Каралеўскай карціннай галерэі** ў Берліне і спрыяе ўздыму музейнага руху ў Германіі. У 1894 годзе арганізаваў першае ў свеце Таварыства сяброў музея.
**8. Артур Хаселіўс (1833-1901)** – у 1891 годзе адкрыў **Скансен** – першы ў свеце музей пад адкрытым небам каля Стакгольма, Швецыя.
**9. Жорж Гуд (1851-1896)** – дырэктар **Нацыянальнага музея ЗША** у складзе Смітсоніан-музея, які ён сам называў Нацыянальным Музеем Культурнай Гісторыі.
**10. Карл Хагенбек (1844-1913)** – у 1907 годзе адкрыў прыватны **заапарк** у Стэлінгене, прыгарад Гамбурга, Германія – першы сафары-парк.
**11. Оскар фон Мілер (1855-1934)** – у 1925 годзе здолеў трансфарміраваць **музей індустрыяльнай тэхналогіі** ў Мюнхене са сховішча, цікавага толькі даследчыкам, у актыўна-адукацыйную установу з шырокім удзелам публікі.
**12. Джон Дана (1859-1929)** – заснаваўшы ў 1909 годзе **Музейную асацыяцыю** ў Неварку, штат Нью-Джэрсі, ЗША – паклаў пачатак руху суседскіх музеяў, арыентаваных, у першую чаргу, на працу з мясцовым насельніцтвам [14].

*Літаратура*

*13. Цыт. па: Alexander E.P. Museum Masters. Their Museums and their Influence. Nashvill, 1983. – P. 16.*
*14. Alexander, E.P. Introduction // Museum Masters. Their Museums and their Influence. Nashville, 1983. – P. 3-10.*

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

### Тэлеканал "АНТ" на выставе "Вытокі духоўнасці"

10 жніўня ў музей-запаведнік завітала здымачная група тэлеканала "АНТ" на чале з Аляксандрам Мацясам. Іх мэтай была падрыхтоўка рэпартажа пра выставу праваслаўных абразоў з фондаў музея, размешчаную ў зале часовых выстаў музейна-выставачнага комплекса.




*А.К. Рак у зале з выставай “Вытокі духоўнасці”*

У здымках прымалі ўдзел супрацоўнікі аддзела фондаў: галоўны захавальнік Аляксандр Рак і старшая навуковая супрацоўніца Ірына Арцем'ева, якія ў сціслай форме, згодна з прапанаваным рэгламентам, удала і змястоўна перадалі мэту нашай выставы, а таксама закцэнтавалі ўвагу на асобных арыгінальных творах, якія на ёй экспануюцца.




*І.Д. Арцем'ева ў зале з выставай “Вытокі духоўнасці”*

Матэрыял выйшаў у эфір увечары 10 жніўня. Пабачыць яго можна і цяпер, скарыстаўшыся наступнай спасылкай: https://www.youtube.com/watch?

v=XUprNe16VgM&ab_channel=%D0%A2%D0%B5%D0%BB%D0%B5%D0%BA%D0%B0%D0%BD%D0%B0%D0%BB%D0%9E%D0%9D%D0%A2 (дыяпазон хвілін: 28:57-31:39).

Прыемна, што звестку пра нашу выставу данеслі да ведама грамадскасці праз тэлебачанне, за што шчыра ўдзячныя Аляксандру Мацясу і яго калегам. Музей заўжды рады зацікаўленым і мэтаскіраваным гасцям, якія ўмеюць цаніць каштоўнасці нашай супольнай гісторыі і культуры, прагнуць задаволіць свой інтарэс у гэтай сферы, дапамагаюць гэтыя каштоўнасці распаўсюджваць.

**Праект, прысвечаны асобе Яўгена Куліка**

У музеі-запаведніку з 25 жніўня да 1 лістапада будзе дзейнічаць мемарыяльны экспазіцыйна-выставачны **праект-акцыя “Аўта/Партрэт Рэканструктара”**, мэтай якога з'яўляецца зварот увагі на асобу Яўгена Куліка – мастака і культурнага дзеяча, які пакінуў свой след у гісторыі Заслаўя і Беларусі агулам. Нагодай для старта дадзенага праекта сталі 85-я гадавіна са дня нараджэння творцы і 20-я – са дня яго смерці.



*Гарадзішча “Замачак” (“Замэчак”). Рэканструкцыя Яўгена Куліка*

Гэты праект-акцыя з'яўляецца ідэяй нашых супрацоўнікаў: Ксеніі Сямашка і Генадзя Сівохіна, імі ж ён і ўвасоблены ў рэчаіснасць у зале габеленаў музейна-выставачнага комплекса. Прастора зала запоўнена арыгінальнымі работамі аўтарства Яўгена Куліка, якія захоўваюцца ў фондах нашага музея-запаведніка, археалагічнымі матэрыяламі – знаходкамі археолагаў з Заслаўя і яго ваколіцы, якія таксама захоўваюцца ў фондавых зборах; у межах праекта спецыяльна падрыхтавана візуалізацыя,

у якую ўключаны як біяграфічныя матэрыялы, так і інтэрв'ю, узятыя ў Алега Трусава, Мікалая Паграноўскага, іншых асоб.

Хіба не ўсім аматарам гісторыі Заслаўя вядома мастацкая рэканструкцыя гарадзішча “Замачак” (“Замэчак”) або старажытнай крэпасці Ізяслаўль, выкананая Яўгенам Кулікам. Гэта праца выкарыстоўвалася ў якасці ілюстрацыйнага матэрыяла ў дакументальным фільме “Тысячелетний Заславль” (Міністэрства культуры, Беларускі відэацэнтр, рэжысёр – Аляксандр Аляксееў, 2013 г.), у кнізе “Горад майго сэрца” (укладальнік – Міхась Казлоў, 2014 г.), іншых друкаваных выданнях, таксама яна заўжды выкарыстоўваецца нашымі супрацоўнікамі падчас аповеду аб старажытнай гісторыі Заслаўя ў межах экскурсійнага суправаджэння наведвальнікаў музея. У межах праекта выстаўлены арыгінал згаданай вышэй рэканструкцыі.



*Частка праекта з арыгінальнымі археалагічнымі знаходкамі з фондаў музея-запаведніка*

Сярод графічных выяў аўтарства Яўгена Куліка, прадстаўленых на выставе, можна пабачыць нямала агульнавядомых для Беларусі помнікаў нашай архітэктуры: Мірскі замак, Сынкавіцкую царкву, Каложскую (Барысаглебскую) царкву. Тут жа побач размяшчаюцца аўтарскія мастацкія рэканструкцыі адзення нашых старажытных продкаў.

Аднак, галоўнай задачай аўтараў праекта быў не проста паказ творчай спадчыны Яўгена Куліка, а спроба зрабіць рэканструкцыю яго вобраза як асобы, спроба, хаця б і часткова, але зразумець матывы яго памкненняў, яго характар, яго пошукі максімальна блізкай да рэчаіснасці рэканструкцыі нашай мінуўшчыны.

Дадатковыя суправаджальныя ілюстратыўныя матэрыялы па адзначаным праекце можна вывучыць на папулярнай турыстычнай платформе izi.travel, скарыстаўшыся qr-кодам, які магчыма адсканаваць непасрэдна на афішы праекта, змешчанай у зале габеленаў нашага музея.

Шчыра спадзяемся, што дадзены праект знойдзе жывы водгук у сэрцах гасцей нашага музея, стане актуальнай згадкай аб выдатным творцы, які прысвяціў сваё жыццё культуры і гісторыі Беларусі, пакінуў па сабе добры ўспамін. А таксама стане пэўным прыкладам для нашых калег па музейнай справе, у сэнсе ажыўлення прасторы пастаянных (нязменных) экспазіцый.

## Выстава ўз'яднання Беларусі

Выстава **“Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі”** з'яўляецца праектам Мінскага абласнога краязнаўчага музея. Яна прысвечана Дню народнага адзінства, які святкуецца 17 верасня. Урачыстае адкрыццё гэтага праекта, які на бягучы момант аб'ехаў усе гарады Мінскай вобласці, адбылося летась у г. Маладзечна, а гэтым часам ён завяршае сваё экспанаванне па гарадах Мінскай вобласці выставай у Заслаўі.




*Выстава “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі”*

Дзень народнага адзінства – гэта свята ўз'яднання беларусаў у межах адной дзяржавы. Вядома, што ў 1919-1920 гг. адбывалася савецка-польская

вайна, у якой Савецкая Расія пацярпела паражэнне ад Польшчы. Па ўмовах міру, падпісанага пасля гэтай вайны, пад уладу Польшчы адыйшла Заходняя Беларусь. Такім чынам, наш народ быў штучна падзелены новай дзяржаўнай мяжой. Усходняя Беларусь, у тым ліку і Заслаўе, заставалася ў складзе БССР. 1 верасня 1939 г. з нападу нацысцкай Германіі на Польшчу пачалася Другая сусветная вайна. Выстаяць у вайне супраць Германіі ў Польшчы не было шанцаў. 17 верасня Чырвоная Армія ўвайшла ў Заходнюю Беларусь – і беларусы зноў уз'ядналіся ў межах адной дзяржавы, штучны падзел нашага народа быў скасаваны.



*Выстава “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі”*

Змест адзначанага вышэй праекта фарміраваўся такім чынам, што кожны музей, у якім ён экспанаваўся, дадаваў нешта сваё (некаторыя гістарычныя прадметы або артэфакты), прапаноўваў пэўныя выявы для банераў. Наш музей-запаведнік дадаў да выставы са сваіх фондавых збораў арыгінальнае адзенне міжваеннага перыяду, шыльду з памежнага слупа СССР-БССР. Насамрэч, гэта даволі цікавы прыклад удалай супольнай перасоўнай выставы музеяў Мінскай вобласці.

Спадзяемся на тое, што наш народ ужо больш ніколі не будзе падзелены хадой гісторыі, а заўжды будзе заставацца адзіным, шчыра будзе шанаваць сваю гісторыю і культуру, захоўваць навакольнае асяроддзе ў чысціні, каб нашай прыродай натхняліся новыя пакаленні таленавітых творцаў, каб ёю маглі цешыцца дзеці, для якіх прырода – крыніца радасці і здароўя.

**_Навуковая праца_**

## Заслаўе ў беларускай культуры

Заслаўе ў беларускай культуры – гэта актуальная з'ява не толькі для нашых суайчыннікаў, але і для гасцей нашай краіны таксама. Калі замежнікі адкрываюць для сябе Беларусь, то часта яны робяць гэта праз пэўныя канкрэтныя месцы: гарады, санаторныя комплексы і аграсядзібы, сустрэча з якімі і ставарае пэўнае агульнае ўражанне пра нашу краіну, культуру і лад жыцця яе насельніцтва. У лік дадзеных мясцін уваходзіць і Заслаўе, якое замежныя турысты нярэдка наведваюць разам з Мінскам.

Аднак, перад тым, як выправіцца ў дарогу, госці, звычайна, ствараюць для сябе некаторы спіс тых месцаў, у якіх яны хацелі б пабываць. Падрыхтоўваецца такі спіс на грунце разнастайных крыніц: пачутага і пабачанага выпадковым чынам (таго, што засталося ў памяці), падказак сяброў і радні, пошуку ў інтэрнэце: на сайтах, у сацыяльных сетках, на старонках перыядычных выданняў (у электронным фармаце).




*“The Minsk Times”, № 26(936) за 14 ліпеня 2022 г.,*
*фотаработа “Паветраны шар над Заслаўем” (аўтар – БЕЛТА)*

Пра Беларусь замежныя турысты нярэдка атрымліваюць інфармацыю з англамоўных выданняў, у тым ліку – спецыяльна адрасаваных для гэтай

катэгорыі патэнцыяльных наведвальнікаў нашай краіны. Да такога кшталту выданняў адносіцца англамоўны сацыяльна-палітычны штотыднёвік “The Minsk Times”, які друкуецца з 2003 г. Установай “Выдавецкі дом “Беларусь сёння”, а зараз – даступны і ў электроннай версіі. Ужо працяглы час у гэтым штотыднёвіку размяшчаюцца арыгінальныя фотаздымкі пад назвай “фота тыдня” (“photo on the week”), якія адлюстроўваюць асаблівасці беларускай прыроды, гісторыі, культуры, сувязь прыроднага ландшафта і архітэктуры.

Так, у № 26 (936) “The Minsk Times” за 14 ліпеня 2022 г. фотаздымкам тыдня стала фотавыява або фотаработа, створаная ў Заслаўі (с. 12). Фотаздымак “Паветраны шар над Заслаўем” (“A balloon over Zaslavl”, аўтар – БЕЛТА) выявіў выдатны ракурс, калі палёт паветранага шара на нізкай вышыні візуальна імітаваў зусім блізкае яго знаходжанне (хаця, насамрэч, ён пралятаў крыху наводдаль) з Заслаўскім кафедральным саборам Праабражэння Гасподня – помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння, храмам, па якім пазнаюць Заслаўе. Нумар штотыднёвіка “The Minsk Times” з дадзенай фотавыявай ёсць у вольным доступе, які можна атрымаць па наступнай спасылцы, адкрыць яго для прагляду або спампаваць: https://www.sb.by/magazine/74/ (афіцыйны сайт газеты “СБ”).

Тое, што фота з заслаўскімі краявідамі трапіла ў англамоўнае выданне, арыентаванае на замежнага чытача, можна лічыць чарговым прызнаннем высокай каштоўнасці Заслаўя для беларускай культуры, якая праз яго прыцягальным чынам адкрываецца патэнцыяльным наведвальнікам нашай краіны. Апрача таго, варта заўважыць і тое, што дадзенае фота было вылучана “The Minsk Times” у якасці лепшага фота тыдня.

## Да спрэчных пытанняў або моцныя бакі музея-запаведніка як спецыфічнай музейнай установы

Час ад часу можна пачуць ад наведвальнікаў, ад заслаўчан, але часцей – ад гасцей горада, пэўную заўвагу наконт таго, што ў Заслаўі няма музея, які б у сваіх экспазіцыях асвятляў бы выключна гісторыю горада ад старажытнасці да сучаснасці на аснове арыгінальных матэрыялаў і артэфактаў, кшталту краязнаўчага музея. Маўляў, гэта не зусім карэктна, што горад не мае такога музея. Нешта ў гэтай заўвазе ёсць і слушнае, але нельга быць радыкальна катэгарычнымі ў сваіх высновах. Чаму? Аб гэтым падрабязней ніжэй.

Па-першае, каб ствараць музей гісторыі горада, трэба валодаць дакладным гістарычным матэрыялам па ўсіх стагоддзях яго існавання, іначай рэканструкцыя такога кшталту будзе цалкам фрагментарнай і даволі спрэчнай. Па Заслаўі з дадзеным матэрыялам маюцца значныя складанасці: па шэрагу перыядаў мы маем зусім няпоўную інфармацыю, а па некаторых – фактычна амаль ніякай, апрача агульнай для ўсёй гісторыі Беларусі і гіпатэтычных дапушчэнняў.

Па-другое, калі зыходзіць з акрэсленай вышэй праблемнай пазіцыі, варта ставіць пытанне аб тым, якім мае быць музей горада: краязнаўчага кшталту або гэта мае быць музей новага тыпу, у чым будзе заключацца яго адметнасць? Калі музей будзе створаны на аснове канцэпцыі краязнаўчых музеяў, якія ствараліся ў Беларусі, напрыклад, у тых жа 1960-1980-х гг., то ці будзе гэта мэтазгодна сучаснаму моманту, насамрэч запатрабаваным?

*Афіцыйны лагатып ДУ “Гісторыка-культурны музей-запаведнік Заслаўе”*

Па-трэцяе, варта адзначыць, што пэўныя моманты гісторыі Заслаўя магчыма раскрываць, што на дадзены момант і робіцца, на аснове ўжо існуючых аб’ектаў (этнаграфічны комплекс, музей-ДОТ, музейна-выставачны комплекс), у тым ліку – у межах часовых выстаў на аснове прадметаў з фондаў музея-запаведніка.

Па-чацвёртае, абавязкова трэба адзначыць перавагі музея-запаведніка перад традыцыйным краязнаўчым музеем. Музей-запаведнік складаецца з шэрагу аб’ектаў, у межах якіх наведвальнікі могуць скласці свой асабісты маршрут і вандраваць, уладкаваць, такім чынам, свой адпачынак на цэлы дзень. Краязнаўчы музей звычайна кампактна месціцца ў адным будынку і не можа прапанаваць наведвальнікам такой магчымасці.

Апрача таго, у склад музея-запаведніка ўваходзяць вельмі розныя па сваім тэматычным змесце аб'екты, што дае магчымасць задаволіць шырокае поле цікаўнасці наведвальнікаў: кожны можа выбраць тут нешта сваё, на свой густ і інтарэс. Аматарам народнай архітэктуры і побыту нашых продкаў дакладна да густу прыйдзецца этнаграфічны комплекс “Млын і кузня” (або “Млын”), аматарам ваеннай гісторыі – музей-ДОТ, цікаўным да міфалогіі нашых продкаў нельга прамінуць Дзіцячы музей міфалогіі і лесу, аматарам розных сваёй тэматычнай скіраванасцю часовых выстаў, народных музычных інструментаў, гандлёвай гісторыі мястэчак і гарадоў Беларусі цікава будзе наведаць музейна-выставачны комплекс. Краязнаўчы музей звычайна не можа зрабіць такой рознапланавай прапановы сваім гасцям.



*Экспазіцыя “Гандлёвая лаўка канца XIX-пачатку XX ст.”*
*або чацвёрты зал музейна-выставачнага комплекса*

У музеі-запаведніку, згодна з даўняй традыцыяй, праводзяцца такія тэатралізаваныя экскурсійныя праграмы як “Каляды” і “Масленіца”, што спрыяе захаванню традыцыйнай культуры нашых продкаў; праводзяцца іншыя тэатралізаваныя праграмы, якія ўзмацняюць інтарэс як нашых суайчыннікаў, так і замежных гасцей да гісторыі і культуры Беларусі. У краязнаўчых музеях звычайна такая работа не вядзецца.

На аб'ектах музея-запаведніка шматразова адбываліся і працягваюць адбывацца здымкі эпізодаў мастацкіх і дакументальных фільмаў,

дызайнерскіх фотапраектаў, пленэры мастакоў. Вядома, што гэта таксама для краязнаўчых музеяў не характэрна.

Таксама варта памятаць пра тое, што ў склад музея-запаведніка з часам могуць дадавацца новыя аб’екты, у ліку якіх можа быць і музей горада, але варта сур’ёзна падумаць аб тым, у якім фармаце ён будзе існаваць, уважліва прапрацаваць усе дэталі і здабыткі сучаснай музейнай справы ў гэтым кірунку.



*Дамавік (Хатнік) у Дзіцячым музеі маіфалогіі і лесу*

Заўважым, што чытачам тут прапанавана зусім не крытыка краязнаўчых музеяў, але толькі адзначаны некаторыя перавагі музея-запаведніка перад гэткім кшталтам устаноў або яго моцныя бакі, пра якія многія забываюцца, калі падыходзяць з выключнай катэгарычнасцю да адсутнасці ў Заслаўі музея горада ў стылі краязнаўчых музеяў, якія былі пабачаны гасцямі ў іншых гарадах.


**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.